УПРАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ ВІЦЕБСКАГА АБЛВЫКАНКАМА

# М а т э р ы я л ы

**першага (школьнага) этапу Рэспубліканскай алімпіяды**
**па вучэбных прадметах**
**“беларуская мова” і “беларуская літаратура”**
**для вучняў X класа ўстаноў адукацыі**
**Віцебскай вобласці**
**(2017/2018 навучальны год)**

ВІЦЕБСК · 2017

# Водгук на мастацкі твор

## Х клас

Максім Танк
Быць чалавекам я рад

Добра быць хваляй марской,
Ветрам, крыніцай, пясчынкай,
Ці неабсяжнай скалой,
Ці мімалётнай сняжынкай;
Добра быць кветкай, травой,
Сонцам, вясёлкавай стужкай
Або ў глушы баравой
Спрытнай звярынай ці птушкай.

Толькі я, зведаўшы ўсё:
Сцюжу, няволю, астрогі,
Попел разбураных сёл
І франтавыя дарогі,
Скіб узараных цяпло,
Смак набрынялай чарэшні,
Дружбы, кахання святло,
Сілу магутную песні, –
Быць чалавекам я рад.
Быць ім хацеў бы заўсёды,
А на ўсё іншае, брат,
Я не даю сваёй згоды.

1954

**I (ШКОЛЬНЫ) ЭТАП РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” І “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”**

**X клас**
**Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры**

| *Заданні* | *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* | *7* | *8* | *9* | *10* | ***Усяго*** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | **50** |

**Заданне 1.** Аформіце тэкст у адпаведнасці з арфаграфічнымі і пунктуацыйнымі нормамі. У першым сказе дапішыце імя і прозвішча (псеўданім) пісьменніка, пра якога апавядаецца ў прыведзеным артыкуле “Свіслацкай газеты”.

*(Максімальная колькасць балаў – **9**;*
*8 б. за пісьменнасць*
*(0,2 б. за кожную арфаграму ці пунктаграму);*
*1 б. за пісьменніка)*

______________________ страс..на любіў прыроду. Яго любоў да прыроды да зямлі мела гл..бокія карані. Ён глядзеў на прыродныя з..явы не толькі як мастак які тонка а..чуваў прыроду і мог перадаць усю яе прыгажосць яе паэзію ўсе а..ценні яе хараства ў сваім трапным слове. Ён глядзеў на ўсе з..явы прыроды і вокам селяніна які бачыць у зямл.. перш за ўсё сродак існавання які цэніць тое што спрыяе добраму ўраджаю а гэтым самым і дабрабыту людзей іх шчасцю і радасці.

Ён любіў упрыгож..ваць зямлю. Пасля (А, а)йчыннай вайны пасадзіў пладовы сад ля сва..го дома садзіў там і іншыя дрэвы дубкі рабінкі бярозкі. Клапаціўся пра кветнікі. Як рады ён быў калі пад дрэвамі прыжыліс.. прывезе..ыя з лес.. некалькі сцяблінак верас.. і чарнічнік.. . Тут(жа) у сад.. ля самага дома была і яго невялічкая як казаў ён “доследная дз..лянка” на якой (што)год праводзіў розныя доследы зас..ваў усякімі гатункамі жыта ячменю правяраў розныя ўгнаенні ўдакладняў спосабы апрацоўкі глебы.

**Заданне 2.** Вызначце ў словах корань і ўкажыце колькасць гукаў, з якіх ён складаецца.

*(Максімальная колькасць балаў – **8**;*
*0,5 б. за кожны правільны адказ)*

| | | | |
|---|---|---|---|
| дагульваць | | сталічны | |
| краіна | | удасканаленне | |
| патроены | | залеплены | |
| праяўленне | | распазнаваць | |

**Заданне 3.** Вызначце і запішыце, якое са значэнняў слова *сухі* рэалізуецца ў прыведзеных словазлучэннях.

*(Максімальная колькасць балаў – **3**;*
*0,5 б. за правільна ўказанае значэнне)*

| | Значэнне |
|---|---|
| сухая кашуля | |
| сухі клімат | |
| сухі батон | |
| сухі куст | |
| сухі тон | |
| сухі лязгат металу | |

**Заданне 4.** Прыведзеныя фразеалагізмы характарызуюць людзей. Запішыце, пра якога чалавека так кажуць.

*(Максімальная колькасць балаў – **5**)*

| | |
|---|---|
| жаба на языку не спячэцца | |
| з ветру вяроўкі ўе | |
| з мухамі ў носе | |
| зух супроць мух | |
| вецер гуляе ў галаве | |

**Заданне 5.** Ад дадзеных слоў утварыце прапанаваным спосабам новыя.

*(Максімальная колькасць балаў – 4)*

| | Прыставачна-бяссуфіксным спосабам | | Суфіксальным спосабам |
|---|---|---|---|
| бераг | | ажурны | |
| разнабой | | муляць | |
| служыць | | мысліць | |
| хапаць | | прас | |

**Заданне 6.** Выявіце граматычныя памылкі ў словазлучэннях і запішыце правільныя формы.

*(Максімальная колькасць балаў – 4)*

Зубасты шчупак, левая броў, цікавы сафары, восеньская бездараж, прыгожая кафля, чарговая эмбарга, дарагое манто, белы вуаль, опернае лібрэта, паўночнаамерыканскае грызлі, мужчынскі кашнэ, прастрэленая шынель, бабуліна камода, цёмна-вішнёвы шаль, моцная кава, непрыкрытая фальш.

________________________________________________________________

________________________________________________________________

________________________________________________________________

________________________________________________________________

________________________________________________________________

________________________________________________________________

________________________________________________________________

________________________________________________________________

**Заданне 7.** Вызначце тып даданай часткі ў наступных сказах.

*(Максімальная колькасць балаў – 2)*

| Сказ | Тып даданай часткі |
|---|---|
| Я не заўважыў, калі мая сталасць настала. | |
| Сям’я перабралася ў вёску, адкуль родам маці. | |
| Не аслабяцца рукі на полі, калі поўна надзеі душа. | |
| Калі ўжо сонейка прыгрэла, Антось на полі кончыў дзела і выпраг коніка сівога, свайго памочніка старога. | |

**Заданне 8.** Да якіх тропаў належаць выдзеленыя ў сказах словы? Запішыце.

*(Максімальная колькасць балаў – **4**)*

| | Тропы |
|---|---|
| Ты далёка, як тое, што будзе праз год, і таму я самотны, ***нібы параход,*** што на беразе ціха, ***як прывід***, стаіць. (В.Шніп) | |
| У лесе ***затрымаўся вечар*** і нанач адпачыць прылёг, калі ***прыціх*** у голлі ***вецер***, пугач узняў перапалох. (А. Астрэйка) | |
| Адмаўлялі маю радзіму, ганьбавалі з усіх бакоў ***Краем лапцяў і курадыму, краем невукаў і жабракоў.*** (В. Іпатава) | |
| А клёны раслі вышынёй ***да нябёс.*** (В. Зуёнак) | |

**Заданне 9.** Па ўрыўках з твораў пазнайце літаратурнага героя. Назавіце твор і яго аўтара.

*(Максімальная колькасць балаў – **6**;*
*0,5 б. за кожны правільны адказ)*

| | Герой | Твор | Аўтар |
|---|---|---|---|
| Невыдумная світка – убор на плячах, Барада, як снег белы – такая… | | | |
| Як я толькі нарадзіўся – Бацька сказаў: “Кепска будзе!” Ну дык жа не памыліўся: Здзекваліся Бог і людзі. | | | |
| “…Па всеміласцівейшаму ўказу нашага гасудара 1881 года, сенцябра 75-га дня…” | | | |
| “Думаеш, глупствам займаюся? Няма каму ваду з калодзежа браць… Раз’ехаліся ўсе…” | | | |

**Заданне 10.** Знайдзіце адпаведнасць паміж прозвішчамі (псеўданімамі) пісьменнікаў і прыведзенымі сцвярджэннямі.

*(Максімальная колькасць балаў – **5**)*

| | |
|---|---|
| А. Якуб Колас | 1. Паэт-наватар, аўтар новых паэтычных формаў |
| Б. Цішка Гартны | 2. Ёй належаць паэтычныя радкі: “Лёгкія сняжынкі ў цішы долу апускаюцца нясмела...”, “Беларускаму краю бясконца я слова «люблю» паўтараю” |
| В. Алесь Разанаў | 3. Народны паэт Беларусі |
| Г. Алена Васілевіч | 4. Сапраўднае прозвішча пісьменніка – Зміцер Жылуновіч |
| Д. Данута Бічэль | 5. Аўтар апавяданняў “Горкі ліпавы мёд”, “Сябры” |

**Адказ**: А__ Б__ В__ Г__ Д __

УПРАЎЛЕННЕ АДУКАЦЫІ ВІЦЕБСКАГА АБЛВЫКАНКАМА

# Д а в е д к і

**першага (школьнага) этапу Рэспубліканскай алімпіяды**
**<u>па вучэбных прадметах</u>**
**<u>“беларуская мова” і “беларуская літаратура”</u>**
**для вучняў X класа агульнаадукацыйных устаноў адукацыі**
**Віцебскай вобласці**
**(2017/2018 навучальны год)**

ВІЦЕБСК · 2017

**I (ШКОЛЬНЫ) ЭТАП РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” І “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”**

**Х клас**
**Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры**

## ДАВЕДКІ

| *Заданні* | *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* | *7* | *8* | *9* | *10* | *Усяго* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | **9** | **8** | **3** | **5** | **4** | **4** | **2** | **4** | **6** | **5** | **50** |

**Пры выкананні заданняў за кожную дапушчаную памылку здымаецца 0,2 бала.**

### Заданне 1

**Якуб Колас** стра**сн**а любіў прыроду. Яго любоў да прыроды**,** да зямлі мела гл**ы**бокія карані. Ён глядзеў на прыродныя з’явы не толькі як мастак**,** які тонка а**д**чуваў прыроду і мог перадаць усю яе прыгажосць**,** яе паэзію**,** усе адценні яе хараства ў сваім трапным слове. Ён глядзеў на ўсе з’явы прыроды і вокам селяніна**,** які бачыць у зямл**і** перш за ўсё сродак існавання**,** які цэніць тое**,** што спрыяе добраму ўраджаю**,** а гэтым самым і дабрабыту людзей**,** іх шчасцю і радасці.

Ён любіў упрыгож**ва**ць зямлю. Пасля **А**йчыннай вайны пасадзіў пладовы сад ля сва**й**го дома**,** садзіў там і іншыя дрэвы**:(–)** дубкі**,** рабінкі**,** бярозкі. Клапаціўся пра кветнікі. Як рады ён быў**,** калі пад дрэвамі прыжыліс**я** прывезе**н**ыя з лесу некалькі сцяблінак верас**у** і чарнічнік**у**. Тут **жа(,)** ў сад**зе(,)** ля самага дома**(,)** была і яго невялічкая**,** як казаў ён**,** “доследная дз**я**лянка”**,** на якой **што**год праводзіў розныя доследы**:(,)** зас**я**ваў усякімі гатункамі жыта**,** ячменю**,** правяраў розныя ўгнаенні**,** удакладняў спосабы апрацоўкі глебы.

### Заданне 2

| | | | |
|---|---|---|---|
| да-**гуль**-ваць | 3 | **сталіч**-ны | 6 |
| **крај**-іна | 4 | у-**дасканал**-енне | 8 |
| па-**тр**-оены | 2 | за-**лепл**-ены | 4 |
| пра-**јаўл**-енне | 4 | распа-**зна**-ваць | 3 |

### Заданне 3

| | |
|---|---|
| сухая кашуля | не мокрая, не змочаная |
| сухі клімат | пазбаўлены вільгаці, не сыры |
| сухі батон | чэрствы, высахлы, высушаны, які страціў свежасць |

| | |
|---|---|
| сухі куст | пазбаўлены спажыўных сокаў, амярцвелы |
| сухі тон | пазбаўлены душэўнай цеплыні, дабрыні |
| сухі лязгат металу | глухі, пазбаўлены гучнасці |

**Заданне 4**

| | |
|---|---|
| жаба на языку не спячэцца | пра балбатлівага |
| з ветру вяроўкі ўе | пра таго, хто гаворыць, сцвярджае што-небудзь без усялякіх падстаў; пра плеткара, выдумшчыка |
| з мухамі ў носе | пра вельмі ўпартага, капрызнага, наравістага |
| зух супроць мух | пра смелага, самаўпэўненага толькі сярод слабых |
| вецер гуляе ў галаве | пра несур’ёзнага чалавека |

**Заданне 5**

| | Прыставачна-бяссуфіксным спосабам | | Суфіксальным спосабам |
|---|---|---|---|
| бераг | узбярэжжа | ажурны | ажурнасць |
| разнабой | уразнабой | муляць | мулкі |
| служыць | паслуга | мысліць | мысленне |
| хапаць | недахоп | прас | прасаваць |

**Заданне 6**

Левае брыво,
цікавае сафары,
чарговае эмбарга,
белая вуаль,
паўночнаамерыканскі грызлі,
мужчынскае кашнэ,
прастрэлены шынель,
непрыкрыты фальш.

**Заданне 7**

| | |
|---|---|
| Я не заўважыў, калі мая сталасць настала. | дапаўняльная |
| Сям’я перабралася ў вёску, адкуль родам маці. | азначальная |
| Не аслабяцца рукі на полі, калі поўна надзеі душа. | акалічнасная ўмовы |
| Калі ўжо сонейка прыгрэла, Антось на полі кончыў дзела і выпраг коніка сівога, свайго памочніка старога. | акалічнасная часу |

**Заданне 8**

| | Тропы |
|---|---|
| Ты далёка, як тое, што будзе праз год, і таму я самотны, ***нібы параход,*** што на беразе ціха, ***як прывід***, стаіць. (В.Шніп) | параўнанне |
| У лесе ***затрымаўся вечар*** і нанач адпачыць прылёг, калі ***прыціх*** у голлі ***вецер***, пугач узняў перапалох.<br>(А. Астрэйка) | метафара |
| Адмаўлялі маю радзіму, ганьбавалі з усіх бакоў ***Краем лапцяў і курадыму, краем невукаў і жабракоў.***<br>(В. Іпатава) | перыфраза |
| А клёны раслі вышынёй ***да нябёс.***<br>(В. Зуёнак) | гіпербалічны эпітэт |

**Заданне 9**

| | Герой | Твор | Аўтар |
|---|---|---|---|
| Невыдумная світка –<br>убор на плячах,<br>Барада, як снег белы –<br>такая… | гусляр | паэма “Курган” | Янка Купала |
| Як я толькі нарадзіўся –<br>Бацька сказаў: “Кепска будзе!”<br>Ну дык жа не памыліўся:<br>Здзекваліся Бог і людзі. | Аліндарка | паэма “Кепска будзе!” | Францішак Багушэвіч |
| “…Па всеміласцівейшаму ўказу нашага гасудара 1881 года, сенцябра 75-га дня…” | Кручкоў | камедыя “Пінская шляхта” | Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч |
| “Думаеш, глупствам займаюся? Няма каму ваду з калодзежа браць… Раз’ехаліся ўсе…” | Мульцік | Драма “Вечар” | Алесь Дудараў |

**Заданне 10**

Адказ: **А3 Б4 В1 Г5 Д2**